УДК 372.882

К. А. Чыкаванава
Аршанскі каледж установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Орша

ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НАВУЧЭНЦАЎ З ДАПАМОГАЙ БУКТРЭЙЛЕРАЎ ДА МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ

Уводзіны. У адпаведнасці з адукацыйным стандартам агульнай сярэдняй адукацыі адной з мэт вучэбнай дысцыпліны «Беларуская літаратура» з'яўляецца фарміраванне эстэтычна развітага, кампетэнтнага чытача, здольнага да паўнавартаснага асэнсавання твораў мастацкай славеснасці. Разам з тым сённяшнія рэаліі сведчаць пра тое, што ў падрастаючага пакалення адсутнічае жаданне знаёміцца з творамі мастацкай літаратуры. Таму для выкладчыкаў актуальнай выступае задача прывіць навучэнцам цікавасць і сфарміраваць у іх устойлівае жаданне знаёміцца з мастацкімі творамі.

Асноўная частка. Матэрыялам праведзенага даследавання стаў аналіз выкарыстання буктрэйлера на занятках па беларускай літаратуры з мэтай развіцця чытацкай кампетэнцыі навучэнцаў I курса каледжа. У час даследавання прымяняліся наступныя метады: апытанне, назіранне і аналіз, вывучэнне прадуктаў дзейнасці навучэнцаў.

Апытанне, праведзенае ў Аршанскім каледжы ВДУ імя П. М. Машэрава сярод 55 навучэнцаў I курса (пятнаццацігадовы ўзрост), паказвае несуцяшальныя вынікі. На пытанне «Якую літаратуру вы любіце чытаць?» 24,9 % (16 чалавек) адказалі: каментарыі ў сацыяльных сетках; змаглі назваць мастацкі твор (ці творы), які падабаецца больш за іншыя, толькі 11 чалавек, прычым 4 з іх не ўспомнілі аўтара твора. Сярод прычын, па якіх навучэнцы не чытаюць творы мастацкай літаратуры, 7 рэспандэнтаў не змаглі назваць ніводнай («проста не чытаю»), 5 навучэнцаў адзначылі, што ў іх не хапае для гэтага часу, 4 сказалі, што іх гэта не цікавіць. Вынікі праведзенага апытання сведчаць пра тое, што перад выкладчыкам літаратуры востра стаіць праблема фарміравання ў навучэнцаў чытацкіх кампетэнцый.

Увогуле пытанне аб фарміраванні чытацкіх кампетэнцый актуальна ў дачыненні да ўсіх вучэбных дысцыплін, бо на кожнай з іх навучэнец працуе з тэкстам: успрымае яго, вылучае галоўнае, адказвае на пытанні, складае канспект і г. д.

Тэрмін «чытацкая кампетэнцыя» ўключае ў сябе сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, авалодаўшы якімі, навучэнец самастойна здольны праводзіць работу па засваенні мастацкага тэксту [1, с. 19].

Такім чынам, «чытацкая кампетэнцыя» — паняцце шматграннае, састаўнымі часткамі якога з'яўляюцца: веданне зместу мастацкага твора; уменне цэласна ўспрымаць твор, улічваць аўтарскую пазіцыю; магчымасць інтэрпрэтацыі прачытанага тэксту; уменне аналізаваць і ацэньваць мастацкі твор і інш.

Працуючы над фарміраваннем чытацкай кампетэнцыі, выкладчык не толькі і не столькі паведамляе навучэнцам пэўную суму ведаў пра вывучаемы твор і яго аўтара, колькі засяроджвае ўвагу на развіцці ў іх здольнасцей да самастойнай работы з мастацкім творам. А каб такія здольнасці сфарміраваліся і развіваліся, неабходна сфарміраваць устойлівае жаданне і патрэбу ў чытанні твораў. Работа ў гэтым накірунку вядзецца рознымі шляхамі, кожны выкладчык распрацоўвае ўласную мадэль фарміравання чытацкай кампетэнцыі навучэнцаў.

Большасць метадыстаў і выкладчыкаў сыходзяцца на тым, што ў вырашэнні праблемы фарміравання чытацкай кампетэнцыі на ўроках літаратуры асаблівае месца адводзіцца выкарыстанню сістэмна-дзейнаснага падыходу, гэта значыць такой арганізацыі працэсу навучання, дзе на першае месца выходзіць самавызначэнне асобы навучэнца. У выніку ён развіваецца як суб'ект жыццядзейнасці, а гэта значыць, што рэалізуюцца патрабаванні, якія прад'яўляюцца да сучаснага адукацыйнага працэсу. Метады, прыёмы, формы работы, якія выкладчык літаратуры выкарыстоўвае на вучэбных занятках пры ажыццяўленні сістэмна-дзейнаснага падыходу, павінны адпавядаць запатрабаванням навучэнцаў у іх самаразвіцці, крочыць у нагу з часам, абапіраючыся і ўлічваючы дасягненні навукі і тэхнікі.

Адным з інавацыйных праёмаў работы па фарміраванні чытацкай кампетэнцыі на ўроках літаратуры, выкарыстанне якога актуальна ў эпоху інфармацыйных тэхналогій, з'яўляецца прыём стварэння буктрэйлера па прачытаным творы. Буктрэйлер прадстаўляе сабой невялікі відэаролік (3—5 хвілін), дзе ў свабоднай форме раскрываецца сюжэт пэўнага мастацкага твора. Дадзены від работы спрыяе прапагандзе («рэкламе») твора з дапамогай візуальных сродкаў, выяўленню чытацкіх схільнасцей навучэнцаў, прыцягненню ўвагі чытачоў (у нашым выпадку навучэнцаў) да кнігі і развіццю на гэтай аснове ўстойлівай цікавасці да мастацкай літаратуры. З другога боку, аўтары буктрэйлера, ствараючы ролік, дэманструюць узровень сфарміраванасці сваёй чытацкай кампетэнцыі, праяўляюць і развіваюць творчыя здольнасці; да таго ж форма буктрэйлера блізкая сучасным падлеткам, а спосабы яго стварэння знаёмыя

© Чыкаванава К. А., 2020

ім (камера ёсць у кожнага навучэнца ў тэлефоне). І, нарэшце, працуючы над буктрэйлерам, навучэнцы дзейнічаюць, самастойна ці ў групах, практычна засвойваючы і асэнсоўваючы вучэбны матэрыял.

Па спосабу візуальнага ўвасаблення тэксту навучэнцы часцей за ўсё ствараюць негульнёвыя буктрэйлеры, якія ўяўляюць сабой набор слайдаў, ілюстрацый, малюнкаў. Падбіраючы ілюстрацыі і цытаты да іх, чытачы вучацца вылучаць галоўнае ў творы, сістэматызаваць прачытаны тэкст, засяроджваюць увагу на значных дэталях. Дадзены від работы даволі аб'ёмны, калі буктрэйлер складаецца да мастацкага твора вялікай эпічнай формы (напрыклад, «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Каласы пад сяром тваім» У. Караткевіча). Звычайна такі буктрэйлер адлюстроўвае асноўныя праблемы, узнятыя аўтарам, ці знаёміць чытачоў з галоўнымі героямі, якім вучні прапаноўваюць уласныя характарыстыкі, падпісваючы слайды або суправаджаючы героя цытатамі з тэксту.

Па асноўным змесце буктрэйлеры бываюць трох відаў: апавядальныя, атмасферныя і канцэптуальныя. Як адзначаюць навучэнцы (78 % з ліку апытаных), прасцей ствараць апавядальныя буктрэйлеры, якія раскрываюць сюжэт мастацкага твора. У гэтым выпадку дастаткова пазнаёміцца з тэкстам, скласці яго план і ўвасобіць у роліку сюжэт, паслядоўна перадаючы асноўныя эпізоды твора.

Стварэнне атмасферных і канцэптуальных буктрэйлераў сведчыць аб больш высокім узроўні чытацкай кампетэнцыі навучэнца. Так, напрыклад, у канцэптуальных буктрэйлерах перадаюцца істотныя ідэі і агульная сэнсавая накіраванасць мастацкага твора, што магчыма зрабіць толькі пасля ўдумлівага прачытання і цэласнага аснсавання, вызначэння аўтарскай пазіцыі, знаёмства з культурна-гістарычным кантэкстам творчасці пісьменніка.

Атмасферны буктрэйлер перадае асноўны настрой кнігі і ўплывае на фарміраванне чытацкіх эмоцый. Для стварэння такога віду буктрэйлера навучэнец павінен пазнаёміцца з гісторыяй напісання мастацкага твора, мастацкімі інтэпрэтацыямі кнігі, магчыма, з крытычнай літаратурай, каб перадаць агульначалавечы змест прачытанага твора, а затым інтэрпрэтаваць яго на аснове асобаснага ўспрымання.

Работа з буктрэйлерам на занятках літаратуры праходзіць у некалькі этапаў. Пачатковы этап — выключна прапагандысцкі: зацікавіць навучэнцаў творам, з якім будзем працаваць на занятках. З гэтай мэтай прапаноўваюцца варыянты буктрэйлераў, якіх шмат у Інтэрнэце. Гатовыя ролікі выкарыстоўваюцца і на этапе абагульнення матэрыялу: на занятках прапаноўваецца некалькі варыянтаў буктрэйлераў, навучэнцы, абгрунтоўваючы свае меркаванні, выбіраюць найбольш удалы, які дакладна перадае атмасферу, праблематыку прачытанага твора.

Наступны этап работы — стварэнне навучэнцамі буктрэйлераў да разгледжаных на вучэбных занятках мастацкіх твораў. Такі падыход дае выкладчыку магчымасць выявіць ступень засваення мастацкага тэксту, пранікнёнасці навучэнцаў у задуму пісьменніка.

Трэці этап — распрацоўка буктрэйлера да самастойна прачытанай кнігі з мэтай прэзентацыі яе іншым навучэнцам. Такі буктрэйлер лічыцца ўдалым, калі хаця б адзін чалавек, прагледзеўшы яго, прачытаў прадстаўленую кнігу.

Стварэнне буктрэйлераў выклікала цікавасць у навучэнцаў І курса Аршанскага каледжа ВДУ імя П. М. Машэрава (якія засвойваюць праграму па беларускай літаратуры за курс 10—11-х класаў), бо такі відэаролік з'яўляецца візуалізацыяй самага цікавага, інтрыгуючага, захапляльнага, занатаванага ў тэксце мастацкага твора. У чэрвені 2019 года ў каледжы быў арганізаваны фестываль, на які навучэнцы першага курса спецыяльнасцей «Пачатковая адукацыя», «Дашкольная адукацыя», «Замежная мова», «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» прадставілі 17 буктрэйлераў.

Заключэнне. На наш погляд, буктрэйлер на занятках літаратуры — гэта эфектыўны прыём навучання, заснаваны на дэманстрацыі чытацкага вопыту навучэнца, яго эстэтычнага густу, а таксама на выяўленні ўзроўню валодання інфармацыйнымі кампетэнцыямі.

У час работы над буктрэйлерам усе састаўныя часткі чытацкай кампетэнцыі задзейнічаныя, развіваюцца, уплываючы адна на другую. Станоўчы момант выкарыстання дадзенага віду работы ў тым, што веды, атрыманыя навучэнцамі ў час заняткаў па беларускай літаратуры, не застаюцца «мёртвымі», ведамі дзеля ведаў, а ўвасабляюцца ў практычныя ўменні і навыкі, бо навучэнцы не пасіўна ўспрымаюць літаратурны матэрыял, а дзейнічаюць, актыўна ўключаюцца ў адукацыйны працэс. Буктрэйлер садзейнічае развіццю ўменняў цэласнага ўспрымання мастацкага тэксту, асэнсаванага спасціжэння яго праблематыкі, пранікнення ў аўтарскую задуму, а гэта значыць спрыяе фарміраванню чытацкай кампетэнцыі на аснове структурна-дзейнаснага падыходу да працэсу навучання.

Спіс цытаваных крыніц

1. *Овсянникова, Т. Г.* Формирование читательской компетенции обучающихся на уроках русского языка и литературы : метод. рекомендации / Т. Г. Овсянникова, И. В. Мовнар, Т. Л. Шишигина. — Вологда : ВИРО, 2016. — 80 с.